Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 17 (669), ● ПЯТНІЦА, 5 мая 1967 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XX

# 9 МАЯ—ДЗЕНЬ ПЕРАМОГІ



*Пачынаецца раніца мірнага горада. Празрыстыя праменні ўзыходзячага сонца лагодна асвятляюць прыгожыя дамы толькі што пабудаваных новых кварталаў, заводаў, фабрык, якія нарадзіліся ў пасляваенны час. Сёння сонца над Мінскам не засланяюць пажарышча вайны, цёмныя хмары ад ўзрываў бомб і снарадаў. Сёння яно чыстае, як крышталь. Няхай яно заўжды будзе такім, няхай ніколі больш свет яго не будзе засланяць ад нас страшная цемра вайны.*

*Фота А. КАДЗЕТА.*

## МУЖНЫЯ І БЯССТРАШНЫЯ

Слаўная праца медыкаў у гады Вялікай Айчыннай вайны была высока ўзнагароджана— вярнулася ў баявыя шарэнгі 72 працэнты раненых і звыш 90 працэнтаў хворых. Ніводная іншая армія не мела такіх высокіх паказчыкаў выздараўлення.

Служачыя медыцынскіх каманд і асабліва ўрачы вайсковых часцей і санітары-насільшчыкі праяўлялі масавы гераізм на фронце. Раненыя, як правіла, выносіліся ў самы кароткі час з поля бою і дастаўляліся на этапы эвакуацыі, дзе яны атрымлівалі кваліфікаваную медыцынскую дапамогу.

Камуністычная партыя і Савецкі ўрад заўсёды ўдзялялі і ўдзяляюць вялікія клопаты медыцынскай службе Савецкай Арміі. Яскравым прыкладам гэтаму быў загад аб узнагароджанні санітараў і санітараў-насільшчыкаў за выратаванне раненых. За доблесную працу, за праяўленую мужнасць і адвагу 30 медыкаў удастоены звання Героя Савецкага Саюза, каля 115000 узнагароджаны ардэнамі і медалямі. Сярод іх і выкладчык нашага універсітэта, член КПСС з 1917 года, заслужаны ўрач БССР Іосіф Анісімавіч Кажанкоў. Ён заўсёды знаходзіўся там, дзе цяжка, дзе неабходна неадкладная дапамога; не шкадуючы свайго жыцця, пад свіст куль і снарадаў ён вынес з поля бою і гэтым самым збярог ад смерці тысячы воінаў Савецкай Арміі.

Няма сумнення ў тым, што, калі агрэсары развяжуць новую вайну, выхаванцы універсітэта прадоўжаць слаўныя баявыя традыцыі сваіх бацькоў.

**Т. ТРЭБКО,**
**генерал-маёр у адстаўцы, выкладчык універсітэта.**

## ПОДЗВІГІ БАЦЬКОЎ НАТХНЯЮЦЬ

Майская раніца. Паркавую магістраль, Кастрычніцкую вуліцу, Ленінскі праспект запоўнілі студэнты нашага універсітэта. Яны спяшаюцца на лекцыі. У іх цудоўны настрой. Прыглядзімся больш уважліва да гэтых жыццярадасных, ахвотных на размову маладых людзей. Сярод іх мы пазнаем сваіх знаёмых.

Наташа Леус—студэнтка геолага-геаграфічнага факультэта. У яе ёсць чаму радавацца. У вучобе ідуць справы выдатна, грамадскія даручэнні таксама выконваюцца добрасумленна. Яна, як кажуць яе сяброўкі, сустрэне Дзень Перамогі дастойна. А вось, перакідваючы па дарозе адна адной жарты, ідуць студэнткі філфака Таня Буслава, Галя Дашкевіч, Ларыса Краўчанка, матфака Аня Фрыдман, Ларыса Галубкова, студэнткі ідуць у прыгожы корпус БДУ.

Званок заглушае шум, які быў да гэтага часу ў аўдыторыях. І тут адчуваецца ўрачыстасць. Нехта са студэнтаў правільна прыкмеціў: свята неяк падбадзёрвае людзей, прыдае ім большую працаздольнасць, жыццярадаснасць.

Выкладчык рускай савецкай літаратуры Соф'я Аляксееўна Лысенка ўваходзіць у аўдыторыю. Нібы па камандзе паднімаюцца са сваіх месц студэнты. Усім ім хочацца павіншаваць былога франтавіка сяржанта Лысенку з Днём Перамогі. Але ці яна адна сёння ўваходзіць да студэнтаў у аўдыторыі, ці толькі яна адна ўспамінае пра тыя цяжкія гады вайны...

Ва універсітэце прафесараў, выкладчыкаў, чые біяграфіі апаліла вайна, многа. Сярод іх вы сустрэнеце Герояў Савецкага Саюза А. А. Філімонава, Д. П. Жмуроўскага, І. П. Кожара, прарэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы А. В. Кірсанава. Іх паважаюць і любяць студэнты, стараюцца заўсёды і ва ўсім браць з іх прыклад, вучацца, як трэба змагацца за сваю Радзіму. Колькі гутарак на патрыятычныя тэмы, слаўных старонак упісаў у жыццё універсітэта былы франтавік Іван Мікалаевіч Лушчыцкі! Цяпер ён доктар філасофскіх навук. Лекцыі Івана Мікалаевіча студэнты слухаюць з захапленнем, яны такія цікавыя і змястоўныя, як і яго жыццё.

А вось маладцаватымі крокамі ідзе чытаць лекцыю будучым журналістам былы лётчык, цяпер дэкан філалагічнага факультэта кандыдат гістарычных навук Р. В. Булацкі. Восемдзесят баявых вылятаў зрабіў Р. В. Булацкі са сваім экіпажам на самалёце, купленым за ўласныя грошы...

Нельга не пазайздросціць бескарыслівай, чулай і бацькоўскай душы дэкана гістарычнага факультэта Пятра Захаравіча Савачкіна, дэкана фізічнага факультэта Івана Пятровіча Зяцькова і многіх, многіх іншых, чые імёны з'яўляюцца для нас прыкладам самаадданага служэння Радзіме, Камуністычнай партыі, народу.

Мы, студэнты ардэнаноснага універсітэта, ганарымся вамі, нашы дарагія выкладчыкі, вы для нас з'яўляецеся настаўнікамі ва ўсім: і ў навуцы, і ў жыцці, і ў працы, і ў пошуках новага. Ваша жыццё заўсёды будзе акрыляць нас на подзвігі ў імя нашай горача любімай сацыялістычнай Радзімы.

## ЛІЧБЫ І ФАКТЫ СВЕДЧАЦЬ

● У другую сусветную вайну была ўцягнута 61 краіна, 80 працэнтаў насельніцтва зямнога шара. Баявыя дзеянні вяліся на тэрыторыі 40 дзяржаў.

● Рашаючую ролю ў разгроме фашысцкай Германіі адыграў Савецкі Саюз і яго ўзброеныя сілы. На савецка-германскім фронце да сярэдзіны 1944 года знаходзілася 70—75 працэнтаў, а пасля адкрыцця другога фронта 65—67 працэнтаў агульнай колькасці дзейнічаючых узброеных сіл Германіі.

● На савецка-германскім фронце было поўнасцю разгромлена 214 і палонена 56 нямецкіх дывізій, знішчана каля 167 тысяч гармат, каля 48 тысяч танкаў і 76 тысяч самалётаў.

● За перыяд Вялікай Айчыннай вайны (з 22 чэрвеня 1941 года па 9 мая 1945 года) беззваротныя страты гітлераўскай Германіі на савецка-германскім фронце склалі 7523 тысячы салдат і афіцэраў, а на другіх франтах другой сусветнай вайны—1877 тысяч чалавек.

● Савецка-германскі фронт існаваў 1418 дзён, такі тэрмін не існаваў ніякі іншы фронт другой сусветнай вайны.

● Другі фронт у Еўропе быў адкрыты толькі 6 ліпеня 1944 года, калі было ўжо вядома што разгром гітлераўскай Германіі немінуемы.

● Сумесна з Савецкай Арміяй на рускім фронце вялі барацьбу польскія, чэхаславацкія вайскі, а на заключным этапе вайны, — таксама румынскія, балгарскія і югаслаўскія злучэнні і аб'яднанні.

● Да канца вайны, нягледзячы на вялікія страты камуністаў на фронце, партыя налічвала ў сваіх шарэнгах 5 мільёнаў 900 тысяч чалавек, з іх у Савецкай Арміі і Флоце знаходзілася 3 мільёны 325 тысяч камуністаў, або 60 працэнтаў.

● За доблесць, адвагу і мужнасць, праяўленыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны, звыш 7 мільёнаў воінаў былі ўзнагароджаны ардэнамі і медалямі Савецкага Саюза. Больш 11 500 воінаў былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза, 104 з іх удастоены гэтага высокага звання двойчы.

## ГОЛАС АРДЭНАНОСНАГА

«Студэнты, аспіранты, прафесары і выкладчыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна поўнасцю падтрымліваюць Зварот Канферэнцыі камуністычных і рабочых партый у Карлавых Варах» — заявіла на мітынгу ва універсітэце сакратар парткома Т. Я. Дударава.

— Ад Камчаткі да Калінінграда, па ўсёй нашай краіне савецкія людзі адабраюць і падтрымліваюць заклік Канферэнцыі камуністычных і рабочых партый Еўропы ўзмацніць дапамогу гераічнаму В'етнаму, які змагаецца супраць амерыканскіх агрэсараў, — заявіў прафесар В. Е. Заўрыеў. — Савецкія людзі дапамаглі і будуць дапамагаць свабодалюбіваму в'етнамскаму народу ў яго справядлівай вызваленчай вайне.

— Мір у В'етнаме не прыдзе сам, — сказала студэнтка Ліза Пазняк, — за яго трэба змагацца штодзённа, кожную гадзіну з усё ўзмацняючай сілай. Няхай амерыканскія захопнікі ведаюць, што в'етнамскі народ нельга перамагчы, таму што на яго баку ўсе сумленныя людзі свету!

Удзельнікі мітынгу аднагалосна прынялі рэзалюцыю, у якой выражаюць поўную падтрымку Звароту Канферэнцыі камуністычных і рабочых партый у Крлавых Варах.

«Правда», 3 мая 1967 года № 123. (17805).



Падняцце Чырвонага Сцяга над Домам Урада ў г. Мінску. Жнівень 1944 года.

# ПЕРШАМАЙСКІ РАПАРТ АРДЭНАНОСНАГА

Першамай. Упрыгожан чырвонымі сцягамі галоўны корпус нашага універсітэта, Плошча Леніна. Усюды святочна апранутыя мінчане. Ласкава свеціць сонца. Яно асвятляе сцягі, лозунгі, транспаранты, партрэты кіраўнікоў Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада, якія нясуць у роўных шарэнгах дэманстрацыі студэнты ардэнаноснага БДУ. Узначальваюць калону прадстаўнікі рэктарата, прафесары, выкладчыкі. Побач з імі студэнты нясуць вялізны партрэт У. І. Леніна, чалавека, з імем якога неразрыўна звязана нараджэнне і далейшае станаўленне універсітэта. Ідуць фізікі, студэнты падрыхтоўчага факультэта, юрысты, хімікі, матэматыкі, геолагі і географы, філолагі, журналісты — увесь мнагатысячны калектыў флагмана беларускай навукі.

Сёння Першамай незвычайны: савецкія людзі сустракаюць яго на працоўнай вахце ў гонар 50-годдзя Савецкай улады. Дастойны падарунак юбілею рыхтуе і наш універсітэт: узятыя высокія сацыялістычныя абавязацельствы паспяхова выконваюцца.

Першамайская калона універсітэта ўступае на Цэнтральную плошчу. Чуваць гукі марша, песні, словы шчырай падзякі і ўдзячнасці роднай Камуністычнай партыі і Савецкаму ўраду. 46 разоў прафесары, выкладчыкі, студэнты дэманструюць сваю адданасць і адзінства з партыяй, урадам, народам, рапартуюць аб паспяховым авалодванні складанымі навукамі. 46 разоў выпускае высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі універсітэт. За час свайго існавання БДУ даў краіне больш 20 тысяч спецыялістаў.

Плячо ў плячо, як браты, ідуць у шматтысячнай калоне савецкія і замежныя студэнты, якія навучаюцца ў БДУ: в'етнамцы, кубінцы, афрыканскія студэнты — дзеці 16 краін свету. Аб іх адзінстве і згуртаванасці гавораць лозунгі, якія яны высока нясуць над галавой: «Няхай жыве Першае Мая—дзень еднасці і згуртаванасці ўсіх народаў свету!», «Няхай жыве КПСС — змагар за мір, дэмакратыю і сацыялізм!», «Няхай заўжды над зямлёй будзе сонца, радасць, шчасце!», «Слава савецкаму студэнцтву!», «Ганьба амерыканскім агрэсарам!», «В'етнам пераможа!».

Святкаванне Першага Мая калектывам універсітэта вылілася ў яркую дэманстрацыю адзінства і згуртаванасці прафесараў, выкладчыкаў, аспірантаў, студэнтаў вакол роднай Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада.



Студэнтка аддзялення журналістыкі Рая Андрыянец рыхтуе перадачу на студыі рэспубліканскага камітэта па радыёвяшчанню.

Фота А. Кадзета.

# КРОЧЫЦЬ «МАЛАДНЯК»

Звініць званок. Ён абвяшчае канец лекцыі. З аўдыторый студэнты высыпаюць на калідор, збіраюцца гуртам, аб нечым спрачаюцца. Спрэчкі самыя розныя — ад малых да вялікіх; яны закранаюць пытанні космасу, музыкі, кіно, тэхнікі. Матэматыкаў цікавіць адно, географаў — другое, нягледзячы нават на тое, што кожны студэнт — гэта студэнт, чалавек, які не абмяжоўваецца якім-небудзь адным колам пытанняў, аднымі думкамі. Калі вы зойдзеце на фізічны факультэт вы ніякім чынам не скажаце, што тут жывуць і вучацца лірыкі, і наадварот. На філфаку студэнты найбольш спрачаюцца аб паэзіі, паэтах, аб часопісах, газетах. Іх цікавіць літаратура. І не выпадкова, калі на факультэце выходзіць «Маладняк», на калідоры недзе павярнуцца: усім хочацца пабачыць новыя творы сваіх таварышаў, пазнаць, як хутка расце і мацнее літаратурная моладзь універсітэта.

Літаратурны дадатак да «Слова філолага» «Маладняк» ужо каля двух гадоў збірае каля сябе і пабуджае на спрэчкі самых розных па характару студэнтаў-філолагаў. У яго па-мастацку аформленых калонках мы бачым почырк тых, каму ў будучым прыдзецца з гонарам прадстаўляць новае маладое пакаленне беларускіх літаратараў, гаспадароў паэзіі, прозы, драматургіі. Хто ведае, можа гэтыя ж фатаграфіі Юркі Голуба ці Сяргея Законнікава разам з падборкай вершаў, якія цяпер змешчаны ў «Маладняку», мы гэтак жа часта зможам бачыць у тоўстых, салідных часопісах або на першай старонцы паэтычных зборнікаў і раманаў.

«Маладняк» — першая магчымасць для пачынаючых выступіць перад масавым чытачом. На старонках гэтага цікавага выпуску можна прачытаць апавяданні, замалёўкі, вершы, артыкулы — усё, на што здольна творчае студэнцтва. Сёння нам ужо вядома, хто з пачынаючых аўтараў, як кажуць, чым дыхае, хто на што мастак; Аляксандр Жук любіць прыкласці пяро да апавядання, Алесь Разанаў і Віктар Ярац спрабуюць свае сілы ў вершах. Усе, хто друкуецца ў «Маладняку» — члены літаратурнага аб'яднання пры газеце «Беларускі універсітэт», аматары спрэчак, дыспутаў, вечароў паэзіі. Цяжка нават падлічыць, колькі карысных паездак зрабілі маладнякоўцы ў калгасы, раённыя цэнтры, школы і прадпрыемствы Мінска! Сёння, у Дзень друку, ад усёй душы хочацца пажадаць маладым літаратарам, новых творчых поспехаў на літаратурнай ніве, многа радасці і вечнага паэтычнага неспакою.

А. КАРАНЧУК.



## Надзейныя памочнікі

- У нашым універсітэце выходзіць дзевяць насценных газет;
- Восем навуковых бюлютэняў;
- Пяць насценных газет выдаецца ў студэнцкіх інтэрнатах;
- Дзевяць камсамольскіх пражэктараў, з іх адзін агульнауніверсітэцкі;
- Васемнаццаць курсавых насценных газет.

## УНІВЕРСІТЭТ ПАМЯТАЕ СВАІХ ВЫХАВАНЦАЎ.

# УЛАДЗІМІР

*У 15 нумары нашай газеты быў змешчан артыкул «У працы і барацьбе», падрыхтаваны студэнтам-журналістам Анатолем Ярохіным. У ім расказвалася аб слаўнай гераічнай гісторыі нашага універсітэта. Сярод вядомых імён былых студэнтаў і выкладчыкаў, выхаванцаў нашага БДУ было названа імя Героя Савецкага Саюза, актыўнага ўдзельніка партызанскай барацьбы ў Беларусі Уладзіміра Аляксеевіча Парахневіча.*

*Анатоль Ярохін падрыхтаваў новы матэрыял, у якім расказваецца пра жыццё і дзейнасць Ул. А. Парахневіча. Гэтым матэрыялам мы адкрываем новую рубрыку «Універсітэт памятае сваіх выхаванцаў».*

ЁСЦЬ на Бабруйшчыне невялікая вёска з нейкай незвычайнай назвай — Аўсімовічы. У гісторыю барацьбы з нямецкімі захопнікамі ўвайшла яна на правах вёскі-героя. Тут нарадзіліся, адчулі сілу, прагу да ведаў і барацьбы дзесяткі мужных сыноў беларускага народа.

Бяспрыкладнай баявой і працоўнай доблесцю мільёнаў савецкіх людзей кавалася перамога над ворагамі. Яны назаўсёды засталіся ў сэрцы і памяці савецкіх людзей. Магілёўская вобласць дала радзіме 82 Героя Савецкага Саюза. Сярод іх—чатыры двойчы Героі Савецкага Саюза. Двое з гэтай слаўнай сям'і, Фёдар Фёдаравіч Архіпенка і Уладзімір Аляксеевіч Парахневіч, з Аўсімовіч.

1918 год. У Аўсімовічах не бывае і хвіліны, каб не прыходзіла трывожная вестка. Па ўсёй краіне ідзе крывавая барацьба, класавыя баі. Рэвалюцыя жыве, змагаецца з апошніх сіл. Толькі на некалькі хвілін у сям'ю Парахневічаў урываецца радасць — нараджаецца сын.

— З Леніным разам, з бальшавікамі назаўсёды, — прыносіць яна ўслед за гэтым з мітынга адавяскоўцаў адзінае жаданне — да канца прадаўжаць справу рэвалюцыі.

— З Леніным, — паўтараюць у Парахневічаў...

Сына называюць Уладзімірам.

А на вуліцы па-ранейшаму ходзяць трывожныя вусткі, нязвыклыя словы: карнілаўшчына, кранштадт, грамадзянская...

Няцяжка здагадацца, якім быў бы лёс Уладзіміра, калі б не перамога Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Звычайны, бязрадасны, цяжкі. А так, хоць і цяжкавата, але ўжо скончана сямігодка. Радуецца маці і бацька, што сын у ФЗН падаўся. А для Уладзіміра і гэтага недастаткова. Яго паплечнікі, равеснікі Кастрычніка, вясковыя хлопцы і дзяўчаты паехалі на вучобу на рабфак. Калі ласка, да нас, — запрашалі ветлівыя аб'явы Беларускага дзяржаўнага універсітэта і іншых вну маладой Беларускай Рэспублікі. Уладзімір не вагаецца. Яму хочацца пазнаць сакрэты вышэйшай матэматыкі, алгебры і фізікі, але што зробіш: з сямігодкай ва універсітэт не пойдзеш. І ён паступова авалодвае ведамі на педрабфаку. З кожным днём мара яго пачала набліжацца ўсё хутчэй і хутчэй...

І вось у кішэні побач з камсамольскім білетам, невялікая кніжачка, у якой напісана: «Уладльнік яго сапраўды з'яўляецца студэнтам Беларускага дзяржаўнага універсітэта». Так для Уладзіміра Аляксеевіча пачаліся незабыўныя дні — дні вучобы ў БДУ.

Вясна 1940 года ў жыцці Парахневіча была знамянальнай. Ён скончыў універсітэт, атрымаў дыплом і паехаў на працу ў Рагаўскую сярэднюю школу, што на Заслаўшчыне. Наперадзе цікавыя справы, далейшыя навуковыя даследаванні. На развітанне сябры моцна паціскаюць рукі, жадаюць шчасця, з крыху затоенай насцярогай смяюцца. Кожны адчувае, што гэтая сустрэча можа быць апошняй. Чорныя пасмы смяротных пажарышч ахутваюць неба Еўропы. На заходніх рубяжах рэспублікі таксама неспакойна. Уладзімір не губляе часу. Усё часцей на яго стале побач з падручнікамі па матэматыцы і вучэбнымі планамі з'яўляюцца кнігі па піратэхніцы, падрыўной справе, розныя інструкцыі.

Вераломны напад фашыстаў на нашу краіну застае Парахневіча ў родных мясцінах. Першае яго жаданне — дабрацца да Бабруйскага ваенкамата. Але гэтая спроба ў самым пачатку церпіць няўдачу. У дваццаці кіламетрах ад горада шлях перараэаюць нямецкія танкеткі. Давялося вярнуцца назад. Сэрца патрыёта не можа змірыцца з бяздзейнасцю. Да таго ж Уладзімір ведае: трапіш у рукі ворага, жыццё абарвецца ні за што...

Трэба змагацца. Толькі



На здымку: Л. М. ПАУЛЮЧЭНКА.

# ЛЕГЕНДАРНЫ СНАЙПЕР

Цеснае сяброўства завязалася паміж студэнтамі нашага універсітэта і легендарным снайперам Вялікай Айчыннай вайны, Героем Савецкага Саюза Людмілай Міхайлаўнай Паўлючэнка.

Мужная патрыётка савецкага народа з першых дзён вайны пайшла на фронт. Бадзёрай і жыццярадаснай яна заўсёды была ў першых шарэнгах, на тых участках фронта, дзе асабліва цяжка.

Легенда ва ўсім свеце ходзіць пра мужных абаронцаў Адэсы і Севастопаля. Сярод тых, хто суткамі без вады і яды, без сна і адпачынку абараняў гэтыя слаўныя гарады, была і Людміла Міхайлаўна. Шмат смярцей знайшлі фашысцкія салдаты і афіцэры ад яе трапных снайперскіх куль. Здавалася, што гэтая жанчына іншы раз не вытрымае, што яна пакіне фронт і паедзе недзе ў тыл, далей ад жудасных падзей вайны. Але ў яе паяўляліся ўсё новыя і новыя сілы. Людміла Міхайлаўна мацней прыціскала снайперскую вінтоўку і трапна страляла ў фашыстаў...

Колькі трывожных хвілін, дзён сапраўднай барацьбы са смерцю перажыла яна, але ўсё перанесла, усё перамагла!

Больш трох гадзін расказвала Людміла Міхайлаўна пра свае франтавыя дарогі, пра мужную барацьбу камуністаў, камсамольцаў, усяго савецкага народа супраць фашысцкіх захопнікаў.

## ПРОМНІ ПРАЖЭКТАРА

Штаб «Камсамольскага пражэктара» філалагічнага факультэта нядаўна папрацаваў над спецыяльным выпускам, які прысвечан найбольш «дысцыплінаваным» студэнтам.

Перад намі фатаграфіі тых, хто павінен сядзець на лекцыі і уважліва слухаць выкладчыка; фатаграфіі, зробленыя скрытай камерай. І вось атрыманы цікавыя факты, якія прамалінейна сведчаць, што некаторыя студэнты на лекцыі займаюцца чым папала, хто на што здольны, але толькі не канспектаваннем.

Вось адна дзяўчына, відаць. з апошняй парты, палажыла сваю буйную галоўку на аб'ёмістую кнігу і патанае ў салодкім сне, другая, — паставіўшы перад сабой маленькае люстэрка, фарбуе свае пяшчотныя губкі, надаючы ім малінавы колер; трэцяя, вырваўшы з непачатага канспекта ліст паперы, старанна выводзіць «Добры дзень, каханенькі, роднenькі!».

І цяпер кожны, хто трапіў у фотааб'ектыў «КП», кідаючы позірк на спецвыпуск з вялікім абурэннем праклінае таго чалавека, хто першы выдумаў гэтую скрытую камеру.

Значнае месца ў выпуску «КП» адведзена і тым студэнтам, асабліва дзяўчатам, што не супраць заглянуць у чарку, задыміць цыгарэтай. Так пазналі сябе у «ласкавых» шаржах пражэктарыстаў, студэнткі пакояў №№ 241, 267, 237, інтэрната па вуліцы Паркавая магістраль.

Стала вядомым з выпуску «КП», што на філфаку ёсць нямала студэнтаў, якія ніяк не могуць разлічыцца з бібліятэкай, трымаюць кнігі па тры — чатыры гады. Хто ведае, можа гэтыя кнігі ўжо даўно «выйшлі са свету», толькі засталіся выведзеныя чорнай тушшу прозвішчы тых губіцеляў, што са святой нянавісцю адносіцца да ўсяго надрукаванага.

А. ТАРЧАНАЎ.

# НАСЦЕННАМУ ДРУКУ — ПАРТЫЙНУЮ ЎВАГУ

Сёння шматтысячная армія савецкіх журналістаў, усе савецкія людзі святкуюць Дзень друку. Гэтае свята адзначаюць таксама карэспандэнты і члены рэдкалегіі факультэцкіх і курсавых насценных газет.

Ва універсітэце дзевяць факультэтаў, столькі ж выдаецца і насценных газет — органаў партыйных, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый. Насценныя газеты адыгрываюць вялікую ролю ў жыцці універсітэта, садзейнічаюць наладжванню навучальнага працэсу і выхавання студэнтаў, аказваюць свой уплыў на навуковую дзейнасць вучоных і аспірантаў. Гэта з поўнай падставай можна сказаць у першую чаргу аб насценнай газеце біялагічнага факультэта «Віта». Члены рэдкалегіі газеты камплектуюцца штогод з ліку прафесарска - выкладчыцкага саставу, аспірантаў і лепшых студэнтаў, якія маюць літаратурныя здольнасці. Такі падыход да справы ўкамплектавання рэдкалегіі, спрыяе таму, што на старонках «Віты» сістэматычна друкуюцца матэрыялы, якія асвятляюць усе бакі вучобы, жыцця, навуковай дзейнасці, побыту выкладчыкаў і студэнтаў.

Трэба адзначыць, што там, дзе партыйнае бюро паўсядзённа займаецца работай рэдкалегіі, аказвае ёй паўсядзённую практычную дапамогу ў вызначэнні тэматыкі выступленняў і падборы аўтараў галоўных матэрыялаў, насценныя газеты выконваюць сваю пачэсную ролю, служаць сродкам уздзеяння партыйных арганізацый на ход жыцця факультэцкіх калектываў. Прыкладам такіх клопатаў з'яўляецца дзейнасць партыйнага бюро гістарычнага факультэта (сакратар т. Мельцар). Кожны месяц рэдкалегія газеты (рэдактар Э. Загарульскі, намеснік В. Руткін) узгадняе з партыйным бюро тэматычны план газеты і з дапамогай партыйнага бюро дабіваецца своечасовага напісання вызначаных артыкулаў кожным аўтарам. Гэтая акалічнасць робіць газету мэтанакіраванай, цікавай і дзейснай.

Тое ж самае можна сказаць і пра заклапочанасць партыйнага бюро хімічнага факультэта (сакратар т. Сіліванчык) аб сваім перыядычным выданні. Раней, калі партыйнае бюро не ўнікала ў работу рэдкалегіі, аддаўшы яе цалкам пад кантроль толькі студэнцкіх арганізацый, газета выходзіла нерэгулярна, тэматыка яе была вузкай, а артыкулы нецікавымі. А калі партыйнае бюро ўлічыла свае памылкі і стала кантраляваць рэдкалегію, дапамагаць ёй у рабоце, клапаціцца аб падборы ў склад рэдкалегіі ініцыятыўных камуністаў і камсамольцаў, такіх як т. Кажушкоў, твар газеты рэзка змяніўся. Цяпер газета хімічнага факультэта адна з лепшых ва універсітэце.

Аднак трэба адзначыць, што на некаторых факультэтах як, напрыклад, на геаграфічным, насценнаму друку не надаецца належнай увагі.

Агульным недахопам насценнага друку унівнрсітэта з'яўляецца перш за ўсё вузасць тэматыкі. Гэта ў першую чаргу датычыцца асвятлення пытанняў партыйнага і камсамольскага жыцця. Мала друкуецца нарысаў і замалёвак пра камуністаў, выкладчыкаў і лепшых студэнтаў. Няма рэцэнзій на кнігі вучоных факультэтаў і студэнцкія навуковыя работы. Слаба пастаўлена кароткая інфармацыя. Не ўсё ў парадку і з мастацкім афармленнем газет, і фотаілюстрацыяй.



Студэнты трэцяга курса аддзялення журналістыкі авалодваюць практыкай запісвання голаса на рэпарцёры.
Фота А. Кадзета.

Набліжаецца 50-годдзе Савецкай улады. Калектыў універсітэта ўзяў у гонар вялікага свята пачэсныя сацыялістычныя абавязацельствы. Іх выканаць будзе нялёгка, таму ўсе сродкі масава-палітычнай работы павінны быць падпарадкаваны гэтай мэце. І тут шырокае поле дзейнасці адкрываецца для насценных газет. Шляхам папулярызацыі ўсяго перадавога і станоўчага, шырокага асвятлення намаганняў калектываў за выкананне ўзятых сацыялістычных абавязацельстваў, прынцыповай і дзелавой крытыкі недахопаў яны могуць унесці свой уклад у ганаровую справу падрыхтоўкі да юбілею. Вось чаму зараз, як ніколі, патрабуецца ўзмацніць партыйны кантроль і дапамогу насценнаму друку.

Ул. БЛАКІТНЫ.

# ПАРАХНЕВІЧ

так можна прынесці карысць радзіме. Не раз прыпаміналіся словы прафесараў БДУ аб тым, што савецкі студэнт ніколі не павінен у любых цяжкасцях станавіцца на калені і прасіць літасці, а змагацца, змагацца да пераможнага канца...

Уладзімір стварае падпольную групу. У яе ўваходзяць Васіль Лукіч Нікіцін, Павел Сцяпанавіч Царапкін, Апанас Фёдаравіч Парахневіч. Група слухае Маскву, распаўсюджвае сярод насельніцтва зводкі Саўінфармбюро, вядзе агітацыю, умела растаўляе народныя сілы для барацьбы. Калі ў падполлі працаваць становіцца немагчыма, група ідзе ў лес, да партызан, якія дзейнічалі на тэрыторыі Кіраўскага раёна. Спачатку радавы падрыўнік, праз год — старшы лейтэнант Уладзімір Парахневіч камандуе дыверсійнай групай партызанскага атрада.

Нялёгкім быў шлях Парахневіча да Героя. Надоўга запамяталася яму, радавому падрыўніку, сур'ёзнае выпрабаванне пад вёскай Старое Сяло, на Рагачоўшчыне. Вёска размясцілася па рацэ Друць. Непадалёку чыгунка разыходзілася ў двух напрамках. І на кожным з іх праз Друць быў перакінуты чыгуначны мост. Надаючы выключнае стратэгічнае значэнне чыгунцы, абодва масты вораг ахоўваў зневерагоднай пільнасцю і заўзятасцю. Спробы партызан узарваць хоць адзін мост заканчваліся няўдачай. І тады народныя мсціўцы рашаюць зрабіць смелую і хітрую справу: узарваць абодва масты разам. Партызанскае камандаванне вылучае для вырашэння гэтай задачы два атрады. У іх ліку і той, дзе партызаніў Уладзімір. У атрадах у сваю чаргу задание рэалізаваць ставілася перад двума ротамі. У склад кожнай з іх уваходзіла дыверсійная група.

Абодва атрады ціха, без лішняга шораху, дабраліся да ўмоўленых пазіцый і па сігналу пайшлі ў наступленне. Атака была настолькі нечаканай і смелай, што немцы і паліцаі не вытрымалі і адкаціліся на другі бераг ракі. Адтуль па масце і адступаючых ударылі кулямёты і мінамёты. Уладзімір першым кінуўся на мост. І раптам зразумеў: зверху маста не ўзарвеш. Ён быў высланы дошкамі. Прыходзіць надзвычай смелае рашэнне:

— Вяроўку, — крычыць ён...

Побач камісар атрада Герасім Лявонавіч Камар. Ён асабіста кіруе аперацыяй.

— Спускайце пад мост,— загадвае камісар.

І Уладзімір умомант вісне над ракой, побач з ім яшчэ некалькі чалавек. Не праходзіць і хвіліны, як пад мастом аказалася закладзена звыш 70 кілаграмаў узрыўчаткі. Калі Уладзіміра паднялі наверх — высветлілася, што бікфордаў шнур заблытаўся ў вяроўках. А час не чакаў.

— Таварыш камісар, дазвольце ўзарваць электрамашынай, — звяртаецца Уладзімір да Камара...

Той некаторы момант глядзіць на яго. У вачах камандзіра Уладзімір адчувае развітальны позірк.

— Нічога не зробіш, нехта ж павінен рызыкаваць... Камар загадвае ўсім адыходзіць.

— Тры, чатыры...—лічыць Уладзімір і паварочвае ручку. Грыміць выбух і як водгулле, за вёскай чуецца другі. Тугая хваля б'е Уладзміра ў грудзі, нясе ў паветра і тым самым ратуе жыццё.

Пасля гэтай аперацыі Уладзімір заслужыў павагу ў атрадзе і аўтарытэт смелага і рашучага чалавека. Ён тым часам рыхтаваў новыя «падарункі» ворагу. Здарылася так, што «лясныя салдаты» пачалі адчуваць вострую патрэбу ва ўзрыўчатцы. Уладзімір арганізаваў яе нарыхтоўку з варожых мін і снарадаў. 210 кілаграмаў выплавіў ён такім чынам.

Ішоў 1943 год. Савецкая Армія граміла ворага на ўсіх франтах. У штабе атрада было атрымана заданне любымі сродкамі спыніць на некалькі дзён рух на важным чыгуначным вузле. Праз дзень на заданне выйшла група падрыўнікоў. Але звестак ад яе не было. Чарговую групу ўзначаліў Парахневіч. Больш сутак дабіраліся яны да чыгункі. Апошнія 80 кіламетраў прышлося дабірацца па бязлеснай мясцовасці... З часу на час іх маглі пазнаць. Выдавала ўзрыўчатка. У трохстах метрах ад палатна прышлося доўга чакаць. Была відаць вышка з вартавым. Лянiва, сюды-туды, на насыпу снаўдаліся вартавыя. Здавалася, што ніякімі сродкамі нельга пераадолець апошнія метры і выканаць заданне. Заставалася адно — рызыкаваць.

— Хто са мной, — спытаў Уладзімір у падрыўнікоў, паказаўшы кіўком галавы напрамак.

Першым адазваўся Ілля Бандарэнка... Паўзлі павольна, імкнучыся зліцца з зямлёй. Было цяжка. Перашкаджала ўзрыўчатка. У кожнага да ног было прывязана па 20 кілаграмаў толу. Так падпаўзлі да палатна. Засталося самае цяжкае — падкласці ўзрыўчатку пад рэйкі. Але гэта зрабіць было немагчыма: у лю-

*(Працяг на 4-й стар.).*

# ГАРТУЙСЯ ЯК СТАЛЬ

## СПАРТЫЎНАЯ СТАРОНКА



ГІМНАСТ.

Фота А. КАДЗЕТА.

## ПЕРАД НОВЫМІ ПАЯДЫНКАМІ

**Група спартсменаў-велагоншчыкаў нашага універсітэта вярнулася днямі з поўдня, дзе яны праводзілі трохнядзельныя трэніроўкі. Мы папрасілі члена зборнай па веласпорту, студэнта першага курса аддзялення журналістыкі В. Сердзюкова расказаць, як нашы спартсмены адпачывалі і ўдасканальвалі свае майстэрства на поўдні**

У дзверы моцна пастукалі: «Пад'ём!» А праз дзесяць мінут веласіпедысты Белсавета ДСТ «Буравеснік» ужо рабілі зарадку на беразе мора. З акна гасцініцы на іх з цікавасцю глядзелі турысты.

Дзевятнаццаць чалавек з розных вну рэспублікі падраўнялі строй і замерлі ў чаканні каманды трэнера. У ліку гэтых 19-ці былі і 9 чалавек са зборнай каманды БДУ.

Так пачаўся першы дзень трохнядзельнага вучэбна-трэніровачнага збору.

Па паводзінах рабят у страі, па іх тварах можна было ўбачыць, хто ўпершыню трапіў на поўдзень, а каму прыходзілася бываць і да гэтага. Студэнта чацвёртага курса фізічнага факультэта майстра спорту Г. Тычыну і В. Дзямідчыка, таксама майстра спорту, студэнта другога курса фізічнага факультэта, збор каля мора амаль не здзіўляў. А вось іх сябра-першакурсніка А. Машчэнку цікавіла літаральна ўсё. Ён упершыню трапіў на поўдзень, упершыню любаваўся Каўказскімі гарамі і Чорным морам. Вочы яго гарэлі агнём радасці і здзіўлення.

Адразу ж, з першага дня, на новым месцы пачаліся трэніроўкі. Велагоншчыкі універсітэта прыступілі да «утаймавання» горных дарог. Спачатку ездзілі асцярожна: хоць бы не зляцець у абрыў...

Але праз некалькі трэніровак асвоіліся і насіліся па складаных дарогах, як карэнныя горцы. Трэнеру Р. І. Васілеўскаму прыходзілася нават стрымліваць гоншчыкаў.

Крутыя спускі мяняліся пад'ёмамі-цягунамі. А пасля— лічаныя кіламетры роўнай шашы, дзе спартсменаў заўсёды чакаў дурманячы пах дзівосных кветак і траў поўдня.

У гасцініцу вярталіся стомленыя ад высокіх пераводаў. Некаторыя адразу браліся пісаць дзённік, заносячы туды ўсё новыя ўражанні. Але большасць накіроўвалася да мора. Хлопцы, трапіўшы на поўдзень, не проста любаваліся. Яны адчувалі ўсе пахі кветак і гул мора не толькі вачыма, але і целам. Шчодрая на фарбы прырода сама імкнулася застацца ў іх думках і адчуваннях.

Але ж трэніроўкі займалі не ўвесь час. Вечарамі студэнты даставалі падручнікі і да позняга часу сядзелі не адрываючы вачэй. Спорт спортам, а вучоба—галоўнае!

Толькі адзін раз сарваўся гэты графік: памяшаў шасцібальны шторм. Усе 19 чалавек высыпалі на пабярэжжа і да поўначы любаваліся кіпячым пад светам фанароў і месяца морам. А назаўтра пасля такога развітання гоншчыкі выехалі ў Мінск.

Цяпер у веласіпедыстаў універсітэта прайшлі першыя трэніроўкі ў родным горадзе.

У мінулым годзе велагоншчыкі нашага універсітэта занялі першае месца сярод вну рэспублікі. Гэты год — яшчэ больш адказны: юбілейны. І спартсмены рыхтуюцца правесці летні сезон у гарачых паядынках.

В. СЕРДЗЮКОЎ.

Н ЯДЗЕЛЯ, 23 красавіка. На маскоўскай шашы веласіпедысты адкрылі свой летні сезон. Каля 200 чалавек удзельнічала ў розыгрышы першынства вну горада Мінска.

Ужо пасля таго, як сваю 15-кіламетровую дыстанцыю закончылі жанчыны, стала зразумелым, што вызначыцца ў гэтых вясенніх спаборніцтвах павінна каманда БДУ. Яшчэ б, першыя два месцы заваявалі нашы спартсменкі. О. Крывадубская паказала вынік 25 мін. 24 сек. На 48 секунд адстала ад яе Т. Паграбенка. І толькі трэцяе месца дасталася студэнтцы ІФК Е. Шубэдзе (26.20).

Юнакі замацавалі поспех. Секундамеры суддзяў спыніліся на 31 мінуце, калі фінішыраваў студэнт універсітэта Рогач. Другі малады гоншчык А. Баеў прайграў пераможцу роўна 30 секунд. Але ў гэты невялікі разрыў удалося ўклініцца студэнту БПІ Г. Карпаву. Карпаў праехаў 20 кіламетраў за 32 мін. 12 сек.

Самая вялікая дыстанцыя — 25 кіламетраў была ў мужчын. Здавалася б, што ўжо нішто не пагражае камандзе універсітэта. Але «моцны пол» падвёў усіх: спаборнічаць не дазволілі некалькім студэнтам за групавую язду. Залік не атрымаўся. Вынік: каманда БДУ змагла заняць толькі трэцяе месца, прапусціўшы наперад спартсменаў БПІ і ІФК. А шкада: вынікі нашых гоншчыкаў вышэй, чым на ўсіх вясенніх першынствах мінулых гадоў.

### ЗНОЎ ГУЧАЦЬ КАМАНДЫ СТАРЦЁРАЎ

В. ІВАНОЎ.



Старанна авалодвае спартыўным майстэрствам член зборнай універсітэта па спартыўнай гімнастыцы Валя Камісарава.

Фота А. Кадзета.

## ВЕСТКІ З ДЫВАНА

Вольная барацьба— папулярны від спорту ў нашым універсітэце. Акрамя спаборніцтваў паміж факультэтамі, на першынство БДУ, штогод праводзяцца класіфікацыйныя сустрэчы па вольнай барацьбе. Яны даюць магчымасць выявіць мацнейшых спартсменаў, а таксама знайсці недахопы ў тэхнічнай падрыхтоўцы «вольнікаў».

Як жа абстаяць справы цяпер, на класіфікацыйных спаборніцтвах, якія нядаўна пачаліся? Трэнер секцыі вольнай барацьбы Е. Стралецкі дзеліцца ўражаннямі аб паядынках:

— Добрыя вынікі на гэтых спаборніцтвах паказваюць спартсмены фізічнага і матэматычнага факультэтаў. Канешне, цяжка сказааць, якія месцы падзеляць яны на гэты раз, спаборніцтвы якраз ў разгары, і фінал іх будзе падведзены пазней. Прыемна і тое, што на спаборніцтвах народзяцца адпаведныя разрады: першы, другі, трэці, якія заслужаць лепшыя і найбольш старанныя спартсмены...

А. ЦЕРАХОВІЧ.

## ПЕРШЫНСТВО ЗА ХІМІКАМІ

*ЦІКАВЫЯ спаборніцтвы адбыліся нядаўна сярод універсітэцкіх аматараў меткай стральбы з малакалібернай вінтоўкі і пісталета. У спаборніцтвах прынялі ўдзел сем каманд ад хімічнага, біялагічнага, матэматычнага, геолага-геаграфічнага, юрыдычнага і філалагічнага факультэтаў. Трэба сказаць, што гэты від спорту ва універсітэце стаў асабліва масавым. Толькі ў гэтых паядынках прынялі ўдзел каля двухсот чалавек. Асабліва ўпартая барацьба за лідэрства ў спаборніцтвах разгарнулася паміж спартсменамі хімфака і біяфака. Перавага была на баку то адной, то другой каманды. Але, як кажуць, перамагае той, хто мацнейшы, у каго больш настойлівасці і мужнасці. Так здарылася і на гэты раз. Хімікі аказаліся самымі мацнейшымі, самымі меткімі стралкамі ва універсітэце.*

*Вось як размясціліся ступенькі першынства паміж факультэтамі: хімічны (1722 ачкі), біялагічны (1673), фізічны (1608), матэматычны (1603), геолага-геаграфічны (1595), юрыдычны (1530), філалагічны (1413). Нажаль, гістарычны факультэт не выставіў каманды на гэтыя спаборніцтвы.*

*Вызначыліся і першыя месцы ў асабістым заліку. Гэта М. С. Міронаў—хімфак, трэці курс—лідэр (95 ачкоў); В. А. Кузьмін—фізфак, чацвёрты курс—другое месца (95 ачкоў); В. В. Сячэйка — геолага-геаграфічны, другі курс—трэцяе месца (94 ачкі).*

*Адначасова былі праведзены спаборніцтвы па стральбе з пісталета на асабістае першынство універсітэта. Першыя месцы заваявалі М. С. Міронаў (91 ачко), В. І. Кавалеўскі—хімфак, трэці курс (90 ачкоў), Е. С. Міронаў (88 ачкоў).*

*На спаборніцтвах былі выкананы нарматывы трэцяга спартыўнага разраду 15 студэнтамі, другога—1.*

*Паядынкі паказалі, што студэнты універсітэта на многа палепшылі свае майстэрства ў гэтым цікавым відзе спорту.*

*В. КОМАР.*

# УЛАДЗІМІР ПАРАХНЕВІЧ

*(Заканчэнне).*

бы момант заўважаць вартавыя, тады аперацыя будзе правалена. Быў адзіны выхад — дачакацца цягніка і пад яго шум падкласці тол пад рэйкі. Так і зрабілі, калі цягнік параўняўся з падрыўнікамі, Уладзімір кінуўся да рэек і пачаў падкладваць узрыўчатку. Ілля трымаў яго за галаву, каб незнарок не зачапіла ступенькамі вагонаў. Хоць палатно было замініравана, але ўзарваць не паспелі. Зноў пачаліся доўгія хвіліны чакання. Кожная — з год. Смельчакам здавалася, што ў іх больш чакаць не хопіць ні сіл ні старання. Але вось удалечыні загрукатаў цягнік. Амаль разам з выбухам Уладзімір і Бандарэнка кінуліся наўцёкі. Праз некалькі крокаў іх падхапіла і збіла з ног гарачая хваля выбуху. Былі страчаны апошнія хвіліны паратунку. Варта адкрыла агонь...

Адступаць прышлося пад двума агнямі: па ворагу адкрылі агонь падрыўнікі. На нейкі момант схаваліся ў жыце. Падаспелі і астатнія. Далей адступленне было адрэзана. Падышла бронепляцоўка, і з яе выехала дзве танкеткі. Праскочыўшы праз жыта, танкеткі накіраваліся назад. Услед за імі прайшла і ахова. Толькі цудам падрыўнікоў не заўважылі. Уладзімір прымае рашэнне адыходзіць праз чыгунку... Толькі праз некалькі дзён вярнуліся яны ў атрад. Рух па чыгунцы быў спынены на 36 гадзін. Цэлы дзень машыны адвозілі мёртвых і раненых фашыстаў ад палатна. На міны наскочыў баявы эшалон з эсэсаўцамі і іх баявой тэхнікай.

За час партызанскай дзейнасці на чыгуначным прагоне Бабруйск — Жлобін група Парахневіча пусціла пад адхон 21 варожы эшалон, у якіх загінула каля 400 і было паранена каля 500 варожых салдат і афіцэраў. Разбіты два танкі, дваццаць тры аўтамашыны, дваццаць паравозаў, дзевяноста сем вагонаў з боеприпасамі і баявой маёмасцю. Пры ўдзеле Парахневіча быў спалены сямідзесяцідвухмятровы мост праз раку Оло на шашы Жлобін—Бабруйск, былі разгромлены паліцэйскія гарнізоны ў вёсках Туркі, Паболава, Падцёлы, Пярэдня і Забуднайскія хутары. Паліцэйскі гарнізон вёскі Вараты Бабруйскага раёна, які складаўся з 47 чалавек, Уладзімірам Парахневічам быў перацягнуты на бок партызан. У сутычках з ворагам ім уласна было знішчана 3 афіцэры і 37 салдат.

За доблесць і мужнасць, праяўленыя ў барацьбе з акупантамі Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 15 жніўня 1944 года Уладзіміру Аляксеевічу было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. І яшчэ адна важная ўзнагарода знайшла свайго героя. Гэтая ўзнагарода— давер'е таварышаў. Верны сын сваёй радзімы ў 1944 годзе падпольным Кіраўскім райкомам партыі быў прыняты ў члены КПСС. Акрамя Залатой Зоркі, грудзі героя-партызана ўпрыгожваюць ордэн Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалі «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» абедзьвюх ступеней.

Скончылася вайна, адгрымелі выбухі рэйкавых паядынкаў, героі-партызаны вярнуліся да сваёй любімай працы. Не «здрадзіў» справе настаўніка і Уладзімір Аляксеевіч. Больш чвэрці стагоддзя ён жаданы і дарагі таварыш, сябра і дарадчык сваіх выхаванцаў —вучняў сталічных школ нашай рэспублікі. Уладзімір Аляксеевіч — аўтар цікавага зборніка задач, актыўны ўдзельнік грамадскага жыцця. У апошнія гады ён узначальваў партыйную арганізацыю адной з Мінскіх школ рабочай моладзі.

Закончан працоўны дзень. Вячэрні прыгажун-Мінск поўніцца вясёлым галасам моладзі, светам рэкламных агнёў. Гэтыя дні асаблівыя: неўзабаве Дзень Перамогі. Усе апрануты пасвяточнаму, усе некуды спяшаюцца. Хто яго ведае, можа сярод іх дзе-небудзь ідзе пажылы чалавек з Зоркай Героя. Угледзься ў яго рысы пільней. Для нас ён не толькі Герой, але старэйшы таварыш, на месцы якога за адным сталом, у адной аўдыторыі мы сядзім ужо не першы год, не ведаючы, што сядзеў тут і Уладзімір Аляксеевіч Парахневіч.

Рэдактар М. І. ІОСЬКА.

АТ 13412 Адрас рэд: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 206, тэлефон Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. № 810.